Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

Год выдання XVII-ы

№ 27 (575)
Субота,
12
верасня 1964 г.

Цана 1 кап.

Цаліннікі вітаюць з пачаткам новага навучальнага года

Тэлеграма з Чапаева

МІНСК БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА РЭКТАРУ.
У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА МЫ ШЛЁМ ПАЛЫМЯНАЕ ПРЫВІТАННЕ І САМЫЯ НАЙЛЕПШЫЯ ПАЖАДАННІ Ў ВУЧОБЕ І НАВУКОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСІМ СТУДЭНТАМ АСПІРАНТАМ І ВЫКЛАДЧЫКАМ ПАВЕДАМЛЯЕМ ШТО ВЫТВОРЧЫЯ ПЛАНЫ АТРАДАЎ УНІВЕРСІТЭТА БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ ДАТЭРМІНОВА А СЛАВА СТУДЭНТАЎ БДУ БУДЗЕ ПРЫУМНОЖАНА НАШЫМІ ПРАЦОЎНЫМІ ПЕРАМОГАМІ — ПА ДАРУЧЭННЮ АТРАДАЎ БДУ КАПРАЎЧУК.

Тэлеграма з Уральска

МІНСК БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ КАМІТЭТ КАМСАМОЛА РЫЛЮКУ. ВІНШУЮ ПАЧАТКАМ НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА. ЖАДАЮ ПОСПЕХАЎ РАБОЦЕ ШЧАСЦЯ АСАБІСТЫМ ЖЫЦЦІ ВЫДАТНАГА НАСТРОЮ. ЦАЛІННІКІ ЎНІВЕРСІТЭТА СУСТРАКАЮЦЬ ПАЧАТАК НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА КАЗАХСКІХ СТЭПАХ ДЗЕ ІДЗЕ БІТВА ВЯЛІКІ ХЛЕБ СУСТРАКАЮЦЬ БАРАЦЬБОЙ АСВАЕННЕ ЗВЫШПЛАНАВАГА МІЛЬЁНА КАПІТАЛАЎКЛАДАННЯЎ — ПАРТОРГ БСБА БЯЛЬКОВІЧ.

Залог далейшых поспехаў

★

Дацэнт А. Я. МАЛЫШАЎ,

прарэктар па вучэбнай рабоце.

★

Нястомныя клопаты партыі акружаюць вышэйшую школу на ўсіх этапах яе развіцця. За адзін толькі год, што прайшоў пасля чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС, прыняты важнейшыя рашэнні, накіраваныя на далейшае развіццё навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах, на новы ўздым завочнай і вячэрняй адукацыі. Паспяхова ўдасканальваецца работа вышэйшай школы на аснове ленінскай ідэі спалучэння навучання з прадукцыйнай працай.

Умацаваліся сувязі ўніверсітэта з вытворчасцю, абагаціліся змест і арганізацыйныя формы навуковай работы, па-новаму чытаюцца вучэбныя курсы, праводзяцца лабараторныя і практычныя заняткі. У вучэбных планах з'явіліся новыя дысцыпліны, якія адлюстроўваюць сучасныя дасягненні навукі і тэхнікі.

Змяніўся і састаў студэнтаў. Каля пяцідзесяці працэнтаў першакурснікаў складаюць асобы, якія маюць вопыт практычнай работы. Іншымі сталі і тыя, каго ў вышэйшых навучальных установах прынята называць «школьнікамі», яны атрымалі, будучы вучнямі, прафесіянальную падрыхтоўку і працоўныя навыкі.

Новыя рэальныя ўмовы жыцця вышэйшай школы, якія склаліся ў выніку паслядоўнага ажыццяўлення ленінскага прынцыпу спалучэння навучання з вытворчай працай, паставілі на парадак дня пытанне аб неабходнасці рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў у больш кароткія, навукова абгрунтаваныя тэрміны, не зніжаючы пры гэтым якасці навучання.

Прынятай нядаўна пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб тэрмінах падрыхтоўкі і паляпшэння выкарыстання спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй» устаноўлены новыя, крыху скарочаныя ў параўнанні з існуючымі, тэрміны падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе.

Так, напрыклад, пачынаючы з 1964 года вочнае навучанне студэнтаў па універсітэцкіх спецыяльнасцях будзе цяпер працягвацца пяць гадоў, акрамя правазнаўства, гісторыі і журналістыкі, дзе тэрмін навучання ўстаноўлены ў чатыры гады.

Рыхтаваць спецыяліста ў больш сцісłыя тэрміны — гэта значыць вучыць яго лепш, больш прадумана, рацыянальна, гэта значыць пазбавіць вучэбныя планы ад другараднага, дабіцца высокай ступені іх узгодненасці. Гэтую задачу цяпер вырашаюць вучоныя ўніверсітэта.

Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР устанаўлівае найбольш рацыянальныя тэрміны правядзення вытворчай практыкі і работы студэнтаў, сканцэнтроўваючы іх галоўным чынам на старэйшых курсах. Наша задача — удасканальваць арганізацыю і змест вытворчай практыкі, умацоўваць сувязі з прамысловымі прадпрыемствамі і калгасамі. Паляпшэнне працоўнага выхавання моладзі — залог далейшых поспехаў вышэйшай школы.

Літарэсы падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў патрабуюць, каб час, адведзены для іх навучання, выкарыстоўваўся з максімальнай паўнатой. Таму самастойная работа студэнтаў з'яўляецца адной з асноўных форм вывучэння праграмнага матэрыялу.

З году ў год павялічваецца прыём студэнтаў ва ўніверсітэт. Сёлета на першы курс прынята студэнтаў у два разы больш, чым у 1956 годзе. Асабліва ўзрос прыём на факультэты — матэматычны, фізічны, хімічны, біялагічны. Тут рыхтуюцца спецыялісты па новых галінах навукі і тэхнікі: вылічальнай матэматыцы і праграмаванню, радыёэлектроніцы і электрафізіцы, квантавай фізіцы і атамнай спектраскапіі, хіміі палімераў, генетыцы, цыталогіі, віруса логіі, біяфізіцы.

У падрыхтоўцы кадраў высокай кваліфікацыі вялікую ролю адыгрывае ва ўніверсітэце сістэма завочнага і вячэрняга навучання. Яна ахоплівае 60 працэнтаў усіх студэнтаў.

Цяпер у БДУ вучацца каля дзесяці тысяч чалавек. Сёлета вучэбную навуковую работу на факультэтах будуць весці 600 выкладчыкаў, якія аб'яднаны ў 61 кафедру.

Беларусь, калісьці непісьменная, адсталая ўскраіна царскай Расіі, дасягнула значных поспехаў у развіцці вышэйшай адукацыі. Цяпер у рэспубліку едуць вучыцца прадстаўнікі многіх краін свету. У нас, у прыватнасці, займаюцца дзяўчаты і юнакі з Кубы, В'етнама, а таксама Ганы, Кеніі і іншых афрыканскіх краін.

Студэнтам створаны ўсе неабходныя ўмовы для заняткаў. З кожным годам умацоўваецца матэрыяльная база ўніверсітэта. Нядаўна ўведзены ў эксплуатацыю будынак галоўнага вучэбнага корпуса, карысная плошча якога складае больш за 20 тысяч квадратных метраў. Вядзецца будаўніцтва яшчэ аднаго вялікага корпуса, дзе размесціцца факультэт радыёфізікі і электронікі. Адначасова ідзе падрыхтоўка да будаўніцтва лабараторнага хімічнага корпуса.

Да пачатку навучальнага года падрыхтаваны добра абсталяваныя шматлікія лабараторыі і кабінеты, вылічальны цэнтр, вытворчыя майстэрні, гісторыка-археалагічны, мінералагічны, заалагічны музеі, бібліятэка з некалькімі чытальнымі залами. Да паслуг студэнтаў і выкладчыкаў клуб, тры спартыўныя залы.

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт імя У. І. Леніна мае ўсё неабходнае для ажыццяўлення задач, што стаяць перад ім па навучанню і выхаванню спецыялістаў высокай кваліфікацыі на глыбокай навукова-тэарэтычнай аснове, у цеснай сувязі з жыццём.

Прафесарска-выкладчыцкі калектыў універсітэта прыкладзе ўсе намаганні, каб выкарыстаць наяўныя магчымасці для падрыхтоўкі кадраў, патрэбных нашай краіне, актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

ДА ЗНАМЯНАЛЬНАГА ЮБІЛЕЮ

Разам з усім савецкім народам калектыў нашага ўніверсітэта рыхтуецца ўрачыста адзначыць 100-годдзе І Інтэрнацыянала. У акадэмічных групах, у студэнцкіх інтэрнатах будуць праведзены лекцыі і гутаркі аб сусветна-гістарычным значэнні І Інтэрнацыянала, аб развіцці міжнароднага камуністычнага руху. Сёння мы публікуем прыкладную тэматыку для выступленняў дакладчыкаў і агітатараў.

Сусветна-гістарычнае значэнне І Інтэрнацыянала.
Праграмныя дакументы І Інтэрнацыянала (Устаноўчы Маніфест і Статут) і іх значэнне.
К. Маркс і Ф. Энгельс — заснавальнікі навуковага камунізма.
Барацьба К. Маркса і Ф. Энгельса супраць сектанцтва і дагматызму, рэфармізму і рэвізіянізму ў рабочым руху.
І Інтэрнацыянал у барацьбе за адзінства рабочага класа.
Міжнароднае таварыства рабочых — першая масавая рэвалюцыйная арганізацыя працоўных.
І Інтэрнацыянал аб вайне і міры і сучаснасць.
К. Маркс і Ф. Энгельс — вялікія правадыры і арганізатары рабочага класа.
І Інтэрнацыянал і масавы рабочы рух.
І Інтэрнацыянал і Парыжская Камуна 1871 года.
І Інтэрнацыянал і рэвалюцыйны рух у Расіі.
Рэвалюцыйныя традыцыі І Інтэрнацыянала і сучасны камуністычны і рабочы рух.
ІІІ Інтэрнацыянал — пераемнік і прадаўжальнік традыцый І Інтэрнацыянала.
КПСС — дастойная пераемніца рэвалюцыйных ідэй і традыцый І Інтэрнацыянала.
Сучасная камуністычныя і рабочыя партыі—дастойныя наследніцы рэвалюцыйных традыцый І Інтэрнацыянала.
Камуністычныя і рабочыя партыі ў барацьбе за ажыццяўленне прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму.
Марксізм-ленінізм — вялікая праграма сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення народаў.
Праграма КПСС — камуністычны маніфест сучаснасці.
КПСС—партыя інтэрнацыяналістаў.

Саюз медыцыны і тэхнікі

У кардыялагічным аддзяленні 4-й клінічнай бальніцы Мінска шырока ўжываюцца такія метады даследавання сэрца, як балістакардыяграфія, фонакардыяграфія і іншыя. Пачата ўкараненне электракімаграфіі і тэлеэлектракардыяграфіі. Розныя бакі дзейнасці сэрца пры гэтым адлюстроўваюцца ў выглядзе характэрных крывых, расшыфраваць якія часам бывае нялёгка. Нават звычайная электракардыяграма часам можа ацэньвацца па-рознаму рознымі ўрачамі-спецыялістамі. Таму зразумела, як важна было б спрасціць працэс расшыфроўкі, зрабіўшы яго аб'ектыўным і больш дакладным.

Такія магчымасці адкрываюцца, калі ўзяць на ўзбраенне апошнія дасягненні электронікі і вылічальнай тэхнікі. Гэтую работу мы вядзём у творчым супрацоўніцтве з маладымі інжынерамі вылічальнага цэнтра БДУ тт. Басяковым, Афанасьевым і іншымі. Ужо атрыманы першыя ўзоры аўтаматычнай расшыфроўкі раду сардэчных паказчыкаў з дапамогай вылічальнай машыны.

Атрымаўшы сукупнасць звестак аб хворым, урач пераходзіць да пастаноўкі дыягназу. Для гэтага ён павінен суміраваць выяўленыя прыкметы хваробы, успомніць пра падобныя хваранні з асабістага вопыту, або з літаратуры, ацаніць верагоднасць той ці іншай хваробы.

Для таго, каб выключыць памылкі ў дыягназу, было вырашана скарыстаць «памяць» вылічальнай машыны. На працягу двух гадоў разам са студэнтамі і супрацоўнікамі БДУ была распрацавана спецыяльная праграма для распазнавання 52 хвароб з болямі ў вобласці сэрца. З дапамогай вылічальнай машыны «Урал» ужо праверана дзесяткі дыягназаў, прычым у некалькіх складаных выпадках машына ўнесла папраўкі, удакладніўшы дыягназ клінічыста.

Тэхніка, электроніка і кібернетыка выступаюць як магутныя памочнікі ўрача, аблягчаючы яго адказную і цяжкую работу. Але няма сумнення, што заўсёды на першым месцы будзе стаяць урач — чалавек, з яго чуласцю, узброены сучаснай медыцынскай тэхнікай.

Г. СІДАРЭНКА,
дацэнт, загадчык кафедры факультэцкай тэрапіі Мінскага медінстытута.

АМАТАРАМ ЛІТАРАТУРЫ

Запрашаем усіх аматараў прыгожага пісьменства — будучых паэтаў, празаікаў, літаратуразнаўцаў на пасяджэнне літаратурнага аб'яднання пры газеце «Беларускі ўніверсітэт», якое адбудзецца паслязаўтра, 14 верасня а 15 гадзіне ў кабінеце беларускай літаратуры (Чырвонаармейская, 6). Работай аб'яднання кіруе беларускі пісьменнік, кандыдат філалагічных навук Іван Якаўлевіч Навуменка.

Падарунак першакурснікам

Зноў запоўніліся ўніверсітэцкія калідоры і аўдыторыі. Шумныя натоўпы ля дошак аб'яў з вялікімі аркушамі раскладаў заняткаў. Усё цікава: новыя дысцыпліны, новыя, яшчэ незнаёмыя выкладчыкі. Пэўна, больш за ўсіх усхваляваны журналісты: сёлета ўведзены скарочаны тэрмін навучання. «А што змянілася ў праграме? А як жа будзе з вытворчай практыкай?»

Сёння трэцяй лекцыяй на 2 курсе аддзялення журналістыкі — адна з асноўных дысцыплін «Тэорыя і практыка партыйна-савецкага друку». Усе з задавальненнем сустракаюць паведамленне выкладчыка — дацэнта М. С. Зярніцкага аб тым, што ў гэтым годзе давядзецца нам вельмі цікавая і карысная справа: выпуск вучэбнай газеты «Журналіст». Гэта будзе вельмі скора. А пакуль што трэба добра падумаць над планам газеты: якія змясціць фотаздымкі, пра што расказаць першакурснікам, якія пытанні заслугоўваюць асаблівай увагі. Для кожнага другакурсніка шырокае поле дзейнасці. Думай, прапаноўвай, спрабуй.

Загарэлыя за лета твары схіляюцца над аркушамі паперы. Большасць студэнтаў не абмяжоўваецца складаннем плану, а адначасова робіць макеты газетных палос. Для многіх — гэта добра знаёмы працэс. Кожны трэці з нас калісьці працаваў у газеце.

Вось здае сваю работу Леанід Дайнека. Фотамантаж «Першакурснікі», выступленні выкладчыкаў і студэнтаў старэйшых курсаў з добрым словам да пачынаючых вучобу, парады маладым паэтам і празаікам, работа СНТ, спартыўныя весткі, гумар, некалькі вершаў. Вось толькі некаторыя тэмы, што прапанаваў Дайнека.

А скора на сталы аўдыторый ляжа свежы, пахнучы друкарскай фарбай нумар газеты «Журналіст», зроблены рукамі будучых журналістаў.

Заняткі працягваюцца. Званкі зноў клічуць нас у аўдыторыі.

С. БАРАДОЎСКІ.

ЦАЛІНА. СТУДЭНЦКІ РАБОЧЫ СЕМЕСТР

Пачатак у № 26.

НАРЭШЦЕ, разбілі два двухкватэрныя дамы, цяпер можна пачынаць падвозку будматэрыялаў. Трапляю на падвозку гравію... На беразе Урала, крыху воддаль ад пасёлка, ляжыць куча шчэбеню, які яшчэ вясной згрузілі тут. Ля берагу стаяць дзве лодкі. Нас трое. Нагрузіўшы магутны «ЗІЛ», займаем месцы на сядзеннях лодак.

У небе чорнымі крыжыкамі трапечуць ластаўкі-берагавушкі. Гнёзды іх чарнеюць акуратнымі радамі-сотамі ў абрывістым беразе. У спіне — прыемная стомленасць. Пачуўшы здалёку шум «ЗІЛа», паскокваем у ваду, змываючы стомленасць. К вечару робіцца цішэй, і слюдзяная гладзь ракі адлюстроўвае супрацьлеглы бераг. Выпадкова выяўляем, што ў гэтым месцы здзіўляюча выразнае рэха. Супрацьлеглы бераг высокі, густа зарослы серабрыстай таполяй, выдатна адбівае гукі. Але калі пачаўся вецер, дрэвы шумна загаманілі, Урал зморшчыўся, як ад зубнога болю, і бездапаможнае рэха адносілася ўніз...

Калі нас, нарэшце, перавялі на будаўніцтва дома, шкада было кідаць «наседжанае» месца...

Такім чынам, 18 ліпеня пераходзім на будаўніцтва двухкватэрнага жылога дома. Нас у брыгадзе 10 чалавек. Спецыялістаў-муляраў трое: Г. Анціпаў, Э. Банькоў і У. Ладысеў. Астатнія ўсе прыстаўлены да іх у якасці «падсобнікаў». Уладзімір Іванавіч прыступічае, вядома, пры закладцы вуглоў, не скупіцца на парады і падказкі.

Спачатку робім многа памылак. Асабліва нас даймалі швы (калі ў некалькіх радах па вертыкалі сыходзіліся швы «па стыку»). Прараб быў строгі, так што нам нярэдка прыходзілася нават перарабляць усё нанава. Было балюча, крыўдна і сорамна, але — што зробіш! Добра, што саман— матэрыял падатлівы, і мы сячом яго сякерай, а іншы раз і абчэсваем сцены. Цэментуючы сродак—гліна, якую мы мяслі спачатку ў ямах, а потым — у скрынках, збітых нашымі цеслярамі.

Дарэчы, цесляры на чале з брыгадзірам А. Краўчанкам поўнасцю задавальнялі патрэбы ва ўсім неабходным: насілках, козлах і г. д. За іх дабротную работу мы іх называлі «чырвонадрэўшчыкамі»...

Працую «падручным» у Генадзя Анціпава. У мінулым будаўнік барысаўскіх «небаскробаў», ён вось ужо другі раз праводзіць свой будаўнічы семестр у Казахстане.

Хутка накідаўшы раствор на сцяну, пазіраю на суседзяў. Насупраць на бакавой сцяне кладку вядзе Эрнест Банькоў — невысокі, рухавы, павязаны ручніком. Эрнест працуе парывіста і нервова, але ўпэўнена і без «аглядкі», як і павінны працаваць знаўцы сваёй справы. У Эрнеста ж вышэйшы, пяты разрад муляра! У яго свой, асаблівы рэжым працы. Брыгадзір У. Ладысеў ніяк не можа «прывучыць» яго да агульнага парадку ў брыгадзе. Праўда, яго прафесіянальныя «капрызы» акупляюцца высакаякаснай, шчодрай працай.

ВЕСТКІ З УРАЛЬШЧЫНЫ

Падобны на яго памочнік Леанід Счыслёнак, гаварун і весялун, душа брыгады. З задавальненнем прыслухоўваешся да яго выразнай, крыху на «о», чалябінскай гаворкі. Працуе ён з незвычайнай лёгкасцю. Калі мяне ахінае стомленасць, я гляджу на яго з зайздрасцю і павагай. Былы ўдзельнік хору на флоце, ён ахвотна і многа спявае, замаўкаючы, як гавораць, толькі тады, калі нырыны смерч праносіцца па вуліцах пасёлка. Магчыма, дзякуючы яму павышаўся наш «тонус працы», і мы давалі па сто з лішнім працэнтаў нормы...

Уладзімір Ладысеў, наш «камбрыг», доўгі, нагала абстрыжаны адным з нашых цырульнікаў, бярэцца за самую карпатлівую працу (вось зараз ён выкладвае вугал, сочачы і за агульным ходам будаўніцтва). У мінулым годзе працаваў у «Стэпавым», не ўтрымаўся і там: пацягнула яго, як пералётную птушку, у «спякотныя краіны». Праўда, не змагла прыехаць з ім яго нявеста, з якой распісаліся напярэдадні яго ад'езду. Магчыма, таму ён іншы раз сумуе па вечарах!.. Тады ён з вечара рыхтуе фарбы і складны мальберт для чарговай мастацкай вылазкі. Я сплю чутка і чую кожны раз, як ён амаль бясшумна пакідае інтэрнат на світанні.

Я прыўзнімаю галаву з падушкі і гляджу ў акно: сонейка яшчэ не выйшла, наводзячы сабе густыя палымяныя румяны, па краі неба расцякаюцца вогненныя рэкі, вышэй, у мяккіх берагах бела-ружовых воблакаў, стаяць яшчэ халодныя шэра-блакітныя лужыны ранішняга неба. Раніца абяцае быць прыгожай. «Шчаслівага эцюднага палявання!» — і я зноў засынаю пад цюрлюканне арла-стэпняка, які сеў на бліжэйшы слуп...

Мы спаборнічаем з брыгадай А. Траскунова, якая будуе такі ж дом у 30—40 метрах ад нас. Дзеля аб'ектыўнасці скажу, што кладка ў іх больш роўная, акуратная, і мы часта кідаем раўнівыя позіркі на іх сцены. Праўда, наш дом расце крыху хутчэй: тры дні запар мы даём 135—140 працэнтаў дзённай нормы. Весела жартуем з суседзяў. Але аказалася, што ў траскуноўцаў дом крыху большы за наш. У выніку ў «баявым лістку» ад 28 ліпеня пад рапартам Ладысева аб завяршэнні кладкі дома мы прачыталі крыху ніжэй рапарт Траскунова, які сцвярджаў, што «...нягледзячы на тое, што брыгада № 5 закончыла кладку на чатыры гадзіны раней, пытанне аб першынстве не можа быць вырашана такім шляхам, таму што аб'ём кладкі нашага дома на 6 кубічных метраў большы»... Што ж, смяецца той, хто смяецца апошні!..

Хочацца адзначыць пастаянную цікавасць усіх жыхароў пасёлка да нашай будоўлі. Нас наведвалі і дзетвара, і моладзь, і сівабародыя старыя. Доўга глядзелі, і па іх вачах мы бачылі, як падабаецца ім наша работа. Памятаю, як цёпла прымалі гледачы выступленне ў саўгасным клубе нашага ансамбля «Саманок», як бурна рэагавалі яны на кожны гол у час футбольных баталій паміж нашай і мясцовай камандамі.

П. САКОВІЧ.

Дзіўная краіна Ісландыя

Своеасаблівасці прыроды Ісландыі і звычак яе жыхароў прымушаюць здзіўляцца нават бачыўшых многае турыстаў. Вельмі цікавыя такія, напрыклад, факты.

У Ісландыі левабаковы рух; тут няма ні трамваяў, ні чыгунак; на востраве не прынята даваць чаявыя; у рэстаранах не прадаюць віно асобам маладзей 21 года; на востраве маюцца падземныя басейны з цёплай вадой, дзе можна купацца; на кожнага жыхара Ісландыі прыходзіцца прыкладна 4—5 авечак; ісландскі парламент — альтынг — з'яўляецца старэйшым у свеце заканадаўчым сходам; са сваёй рэзідэнцыі ў Бесастадыры ісландскі прэзідэнт можа аглядаць тэрыторыю, на якой жывуць $^2/_3$ насельніцтва краіны; на востраве няма сваёй арміі і няма воінскай павіннасці; тут няма прозвішчаў у звычайным сэнсе слова — дзеці прымаюць імя бацькі з дабаўленнем адпаведных канчаткаў: сон (сын) і доццір (дачка); пасля замужжа жанчына захоўвае дзявоцкае прозвішча; дзеля захоўвання чысціні ў сталіцы Ісландыі забаронена трымаць сабак.





Гледачы даравалі салісту ўніверсітэцкай мастацкай самадзейнасці Валерыю Ізотаву яго крыху несцэнічны выгляд. Што зробіць, калі выступаць даводзіцца і ў дрэннае надвор'е. Так было і на гэты раз — холад прымусіў пацяплей апрануцца і артыста, і гледачоў—калгаснікаў адной з вёсак Мінскага раёна.

СТУДЭНТЫ!

Ці ўсе вы падпісаліся на беларускія маладзёжныя газеты

«ЗНАМЯ ЮНОСТИ» і «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»

на IV квартал гэтага года? Спяшайцеся, бо падпіска прымаецца яшчэ толькі на працягу тыдня.

Даніла ШЫЛА вярнуўся з канікул

ДЛЯ ЧАГО ПАТРЭБНЫ ДЗВЕРЫ?

Прызнацца, вельмі засумаваў я па ўніверсітэту. Сёлетняе лета мне здалося занадта доўгім. Можа, таму, што пакуль я аб'ехаў галоўныя цэнтры студэнцкага працоўнага семестра, прыйшлося мінуць многія тысячы кіламетраў. І гэта не здзіўляюча: адні аказаліся на цаліне, другія — у Салігорску, трэція — на Нарачы. Сустракаў я сваіх і ў калгасах, і на будоўлях.

І вось я на вакзале. Зразумела, да пачатку навучальнага года спазніўся. Праўда, я дамовіўся са старастай групы, каб ён мяне адзначаў рэгулярна, як акуратнага наведвальніка заняткаў. Пабяцаў прывезці яму што-небудзь да слоіка марынаваных грыбоў, які ён у канцы канікул выпрасіў у сваёй бабулі.

Дарэчы, я ўхіліўся ад асноўнага. Выбачайце. Значыцца, прыбыў на вакзал і адразу паспяшаўся хутчэй да сваіх сяброў ва ўніверсітэт. Турбаваўся толькі: а што, калі ідзе лекцыя і прыйдзецца доўга чакаць.

Аднак мне пашанцавала. Ужо каля медінстытута пачуў званок. Прашу прабачыць, я зноў ухілюся. Мне гаварылі па сакрэту, што хутка званкоў у галоўным корпусе не будзе. Іх хочуць купіць пажарнікі. І не выпадкова. Паслухаўшы іх з паўгадзіны, усю ноч спаць не будзеш. Некаторыя сцвярджаюць, што нават болей, асабліва ў каго галава слабая.

Я, зразумела, пастаяў каля медінстытута на ўсякі выпадак. Няхай, думаю, пазвоніць без мяне, я ж па яму не засумаваў.

І якія жахі! Ужо крокаў за дзесяць бачу — зніклі дзверы ў галоўным корпусе. Гэта з боку сквера. З сотню чалавек стаяць на прыступках, нешта крычаць, аб чымсьці спрачаюцца. Хто-ніхто пабег да медінстытута, каб прарвацца кругом.

Нічога не разумею, але і не адчайваюся. Падыходжу бліжэй і чую галасы: «Каменданта... каменданта... каменданта...». А чаму не падрыўніка? Сапраўды, калі дзверы заваліла, то лепш звяць на дапамогу чалавека, які зрабіў бы новую адтуліну ў сцяне.

Уціскаюся ў натоўп. Спачатку не ўдалася. Потым, калі мне раза тры наступілі на нагу, я стаў працаваць лакцямі і па-а-айшоў. Праўда, атрымаў грымака пад бок.

Аказваецца, дзверы на месцы. А што з таго? Адчынена адна палавінка дзвярэй з васьмі. Гэтак з паўметра шырынёй. На перапынку многім трэба бегчы ў іншыя вучэбныя карпусы, адтуль таксама бягуць. І ўтварыўся затор... У агульным, самі разумееце, што мне намялі бакі добра. Іншым таксама.

І тут мяне такая злосць разабрала! Браткі, за што?! Дзеля чаго тады тут дзверы?

І, сапраўды, для чаго патрэбны дзверы і што гэта такое?

Я рашыў неадкладна ўзяць інтэрв'ю. Вось некаторыя адказы студэнтаў і выкладчыкаў. Усі выказванні не магу прывесці, бо трапляліся такія выразы, якія ў слоўніку Даля растлумачваюцца шматкроп'ем.

«Дзверы — гэта вавілонскае стаўпатварэнне...»

«Дзверы — гэта адтуліна ў сцяне, прамавугольнай формы...»

«Дзверы — сродак для масажыравання...»

А вось па думцы работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, яны, пэўна, будуць абазначаць проста стэнд, на якім можна прымацоўваць прыгожую аб'яву: «Дзверы зачынены. Ходу няма».

Паспрабуй разабрацца. Ніякай узгодненасці, яснасці! Пытанне зусім не вывучанае, навукова не абаснаванае. І дзе? Ва ўніверсітэце! Як магло здарыцца, што праблема дзвярэй не стала тэмай спецыяльнага даследавання? Я і падумаў, ці не прапанаваць гэтую тэму хаця б для паступаючых сёлета ў аспірантуру? Або пальму першынства не захоча ўступіць адміністрацыйна-гаспадарчая частка?

Даніла ШЫЛА.

Рэдактар М. ІОСЬКА.

Адрас рэдакцыі:
г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02383. Тыр. 2000. Зак. 3235.